## Мадэрнізацыя як стыль жыцця

**ААТ «Жарабковічы» – адно з тых сельгаспрадпрыемстваў, дзе любоў да роднай зямлі і прафесіяналізм злучаюцца разам, ствараючы аснову дабрабыту не толькі сваіх працаўнікоў, а ў многім і раёна.** Каб прадпрыемства развівалася стабільна і павышаўся дабрабыт людзей, стараемся ісці ў нагу з часам. Вялікую ўвагу надаём выкарыстанню ў вытворчых працэсах інавацыйных аграрных распрацовак і ўкараненню перадавых тэхналогій, абнаўленню машынна-трактарнага парка, выкананню агратэхнічных патрабаванняў і тэхнічных рэгламентаў, – падкрэслівае дырэктар ААТ «Жарабковічы».
Лічбы пацвярджаюць правільнасць выбранага шляху і дэманструюць высокую эфектыўнасць вытворчасці.

Цэх па вырабе рапсавага алею – выгадная фішка ААТ, якая таксама напаўняе кашалёк прадпрыемства. Рапсавы алей рэалізуюць беларускім прадпрыемствам харчовай прамысловасці і ў поўным аб'ёме забяспечаны высакаякасным бялком для корму жывёлы.

Днямі выканалі дзяржзаказ па цукровых бураках, ураджайнасць якіх склала 502 цэнтнеры з гектара. І гэта плюс 100 цэнтнераў з гектара да ўзроўню 2020года.«Жарабковічы» такія ва ўсіх сферах дзейнасці – грунтоўныя, нераўнадушныя і максі-мальныя. Калі рабіць, то са знакам якасці. Кіраўнік сельгаспрадпрыемства Андрэй Новік падкрэслівае, што паказчыкі прадпрыемства – вынік каманднай працы, дзе кожны адчувае асабістую адказнасць за агульную справу.
Яскравы паказчык руху наперад – будоўля. Начальнік службы капітальнага будаўніцтва Леанід Варвашэвіч пералічвае зробленае за апошнія два гады і падводзіць вынікі пяцігодкі. І яны маштабныя: у строй уведзены восем новых аб'ектаў, рэканструяваны і адрамантаваны шматлікія памяшканні фермаў, зернясховішчаў і г. д. Сёння ААТ нагадвае суцэльную будаўнічую пляцоўку, на якой памяшканні і будынкі набываюць новае жыццё.
Сёлета на абласных «Дажынках» прозвішчы працаўнікоў «Жарабковічаў» не раз гучалі са сцэны.

#здоровые _города